За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 8 (79) Жнівень 2013 г.

Лекар-праўдалюб Ігар Пастноў зьмешчаны ў псыхлякарню

Доктар *Ігар Пастноў*, які супрацоўнічаў зь недзяржаўнымі мэдыямі і ня раз крытыкаваў мясцовыя ўлады на чале з губэрнатарам Аляксандрам Косінцам за занядбаны стан мэдыцыны ў рэгіёне і карупцыю, прымусова зьмешчаны ў закрытае аддзяленьне № 2 Віцебскага абласнога клінічнага цэнтру псыхіятрыі і наркалёгіі — менавіта ў гэтай установе ён працаваў. Каб зьмясьціць лекара ў вар'ятню, да яго прыйшлі на працоўнае месца і прад'явілі адпаведную пастанову пракурора.



Ігар Пастноў

Ігар Пастноў за свае публічныя выказваньні і актыўную жыцьцёвую пазыцыю шмат разоў падвяргаўся рэпрэсіям. Сёлета ў студзені ён быў звольнены з пасады дзіцячага лекара. Каб знайсьці новую працу, спатрэбілася некалькі месяцаў. Нядаўна апальны лекар распавёў пра незадаволенасьць ідэоляга на новым працоўным месцы яго крытыкай уладаў і кіраўніцтва ўстановы аховы здароўя, дзе ён пачаў працаваць, у інтэрнэце.

У інтэрнэце доктар Пастноў апублікаваў некалькі відэаролікаў. Па гіроніі, менавіта стану спраў у псыхіятрыі быў прысьвечаны яго апошні відэазварот, які зьявіўся ў сеціве 4 жніўня. У сваім звароце лекар падзяліўся з гледачамі інфармацыяй пра факты прымусовай шпіталізацыі жыхароў Віцебску ў псыхлякарню.

Лекары — калегі Ігара Пастнова ў шоку, але пра акалічнасьці справы маўчаць. Спадар Пастноў па затрыманьні зьвязаўся з журналістамі: «Не выключаю, што да мяне будуць ужытыя ўсе "вабноты псыхушкі". З гэтай нагоды заяўляю пратэст і прашу грамадзкасьць гораду Віцебску і ўсіх тых, хто мяне знае, не пакідаць самавольства беспакараным! Пакуль знаходжуся ў асобнай палаце, пэрсанал аддзяленьня ставіцца да мяне добразычліва», — паведаміў доктар.

Ігар Пастноў пісьмова адмовіўся ад якіх-небудзь мэдычных працэдур і запатрабаваў ад галоўнага лекара УАЗ «ВАКЦ псыхіятрыі і наркалёгіі» Алены Мартынавай скліканьня незалежнай псыхіятрычнай камісіі. Праз свайго сябра ён накіраваў скаргу ў Генэральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

21 жніўня судзьдзя Тацьцяна Дзегцярова суду Віцебскага раёну на падставе рашэньня ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі (УКК) і са згоды Віцебскай гарадзкой пракуратуры ў прысутнасьці намесьніка галоўнага ўрача па мэдычнай частцы па псыхіятрыі УАЗ Віцебскага абласнога клінічнага цэнтру псыхіятрыі і наркалёгіі І. Панамарова вынесла пастанову аб прымусовым псыхіятрычным лячэньні Ігара Пастнова. Паседжаньне суду праходзіла без удзелу грамадзкасьці, прадстаўніка пракуратуры, законнага абаронцы, самога спадара Пастнова і яго блізкіх сваякоў.

Згодна з рашэньнем суду цягам найбліжэйшых месяцаў Ігар Пастноў падлягае лячэньню і штомесячнаму агляду УВК, якая будзе вызначаць ступень ачуньваньня апанэнта ўлады і неабходнасьці працягу яго лячэньня. Таксама, на падставе арт. 40 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб аказаньні псыхіятрычнай дапамогі», кіраўніцтвам лячэбнай установы прынятае рашэньне пра абмежаваньне права апальнага лекара на вядзеньне ліставаньня, атрыманьне і адпраўку тэлеграмаў, лістоў, грашовых пераказаў, пасылак і бандэроляў, атрыманьне рознага кшталту перадач.

Апроч таго, яму забаронена карыстацца тэлефонам і прымаць наведвальнікаў, мець і набываць прадметы першай неабходнасьці, карыстацца ўласнай вопраткай.

Amnesty International: *Ігар Пастноў, магчыма, будзе прызнаны вязьнем сумленьня*

Праваабарончая арганізацыя Amnesty International заступілася за віцебскага лекара Ігара Пастнова, зьмешчанага згодна з рашэньнем суду ў вар'ятню дзеля прымусовага лячэньня. Арганізацыя заклікала ўсіх неабыякавых да тэрміновай акцыі: напісаць на беларускай, расейскай, ангельскай або сваёй роднай мове лісты на адрас міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Васіля Жарко і генпракурора Аляксандра Канюка.



Міжнародная праваабарончая арганізацыя просіць тых, хто будзе пісаць лісты, нагадаць адказным службовым асобам Беларусі, што прымусовае псыхіятрычнае лячэньне трэба ўжываць толькі ў выпадках цяжкіх псыхічных захворваньняў, калі існуе небясьпека, што чалавек дакладна нанясе непазбежную шкоду сабе або іншым. Таксама аўтарам зваротаў да беларускіх прадстаўнікоў улады рэкамэндуецца запатрабаваць ад апошніх прызначыць паўторную псыхіятрычную экспэртызу доктару Ігару Пастнову, і забясьпечыць, каб яму былі забясьпечаныя належныя юрыдычныя кансультацыі і аказаная неабходная адвакацкая абарона.

У дакумэнце, апублікаваным пад загалоўкам «Шчыры псыхіятар гвалтоўна пазбаўлены волі», Amnesty International паведамляе, як разьвіваліся падзеі:

«Псыхіятар зь Беларусі Ігар Пастноў быў гвалтоўна зьмешчаны на лячэньне ў шпіталь, у якім ён працаваў, пасьля яго адкрытай крытыкі сыстэмы аховы здароўя ў Віцебску, горадзе на поўначы краіны. Ігар Пастноў, які працуе ў Віцебскім абласным цэнтры псыхіятрыі і наркалёгіі, цягам апошніх 18 месяцаў распаўсюдзіў шэраг інтэрвію на YouTube з крытыкай палітыкі ўраду і гарадзкога кіраўніцтва аховы здароўя. У сваіх інтэрвію ён узьнімаў такія пытаньні, як мэдычныя памылкі і нямэтавае выкарыстаньне сродкаў. У чэрвені 2013 году ён выступіў з крытыкай выкарыстоўваньня міліцыі дзеля зьмяшчэньня ў шпіталь на псыхіятрычны агляд бамжоў і валацугаў».

«З-за сваёй адкрытай крытыкі Ігар Пастноў меў канфлікты з кіраўніцтвам, а 16 жніўня псыхіятрычная камісія шпіталя, у якім ён працаваў, зрабіла выснову, што ён мае патрэбу ў прымусовым псыхіятрычным лячэньні ў сувязі з "псыхапатычным разладзьдзем асобы з маніяй перасьледу ўладамі". У той дзень Ігар Пастноў патэлефанаваў журналісту Радыё Свабода, каб сказаць, што ён зьняволены, пасьля чаго яго тэлефон быў адключаны», — паведамляе Amnesty International падрабязнасьці.

Ігар Пастноў, магчыма, быў зьмешчаны ў шпіталь за яго не забароненую законам крытыку стану аховы здароўя ў Віцебскай вобласьці. Калі гэта пацьвердзіцца, Amnesty International прызнае яго вязьнем сумленьня, паведамляе дакумэнт, апублікаваны ўплывовай міжнароднай праваабарончай арганізацыяй.

У Віцебску затрымалі распаўсюдніка ўлётак пра «Народны рэфэрэндум»

Віцебскі актывіст **Андрэй Андрэеў** распаўсюджваў улёткі з інфармацыяй пра «Народны рэфэрэндум». Пра яго затрыманьне паведаміла каардынатарка кампаніі "Гавары праўду" па Віцебскай вобласьці **Лідзія Сагідуліна**: за спадаром Андрэевым сачылі невядомыя з цывільнай машыны. Калі ён увайшоў у адзін з пад'ездаў, праз пару хвілін увайшлі і яны, прапанавалі праехаць зь імі ў Кастрычніцкі РАУС Віцебску.

У міліцэйскім пастарунку на актывіста склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні, прадугледжаным артыкулам 22.9 КаАП (парушэньне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі). 700 асобнікаў улётак былі канфіскаваныя. Цяпер Андрэя Андрэева чакае суд. Калі судзьдзя стане на бок супрацоўнікаў аховы правапарадку, актывісту пагражае штраф у памеры ад 20-ці да 50-ці базавых велічынь.

Дэпартамэнт выкананьня пакараньняў баіцца галоснасьці?

Дэпартамэнт выкананьня пакараньняў МУС Рэспублікі Беларусь ня даў дазволу незалежнаму журналісту наведаць установы пэнітэнцыярнай сыстэмы. З адпаведнай заявай зьвярнуўся ў дэпартамэнт віцебскі *сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў Кастусь Мардзьвінцаў*. **«Кіраўніцтва дэпартамэнту лічыць немэтазгодным наведваньне Вамі папраўчых калёніяў крымінальна-выканаўчай сыстэмы МУС Рэспублікі Беларусь»**, — паведаміў заяўніку *першы намесьнік начальніка ДВП С.І. Працэнка.*

Кастусь Мардзьвінцаў меркаваў наведаць адну з папраўчых калёніяў Віцебскай вобласьці, каб азнаёміцца з бытам і ўмовамі ўтрыманьня зьняволеных і пасьля падрыхтаваць матэрыялы для публікацыі ў СМІ. На думку журналіста, супрацоўнікі Дэпартамэнту выкананьня пакараньняў, пазбавіўшы яго магчымасьці наведаць калёнію, парушылі артыкул 36 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», які забясьпечвае права грамадзян на атрыманьне і распаўсюд інфармацыі.



Кастусь Мардзьвінцаў

«Тлумачачы, чаму я не магу наведаць калёнію, намесьнік начальніка ДВП нават спаслаўся на закон — на частку 2 артыкулу 22 Крымінальна-выканаўчага кодэксу. Але гляньма, што гаворыцца ў згаданай частцы кодэксу: "Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і іншыя асобы маюць права наведваць установы, якія выконваюць пакараньне, з дазволу адміністрацыі гэтых устаноў або адпаведных вышэйстаячых органаў кіраваньня ўстановамі, якія выконваюць пакараньне". Такім чынам, права наведваць калёнію маю. І па дазвол я зьвярнуўся па адрасе — у "вышэйстаячы орган". Дзіўна, дзе тут спадар Працэнка ўбачыў падставу, каб пазбавіць мяне права, якім я валодаю згодна з названым ім жа самім артыкулам? **Дзеяньні кіраўніцтва дэпартамэнту выкананьня пакараньня — гэта самавольства, не заснаванае на законе. Напэўна, яно мае, што ўтойваць ад грамадзкасьці, калі баіцца пусьціць журналістаў у турмы**», — лічыць Кастусь Мардзьвінцаў.

Невядомыя зьбілі і спрабавалі скрасьці наваполацкага актывіста Яўгена Парчынскага


Яўген Парчынскі

12 жніўня каля 16-й дня Яўген Парчынскі вяртаўся дахаты і каля свайго пад'езду заўважыў "Фальксваген" цёмнага колеру. Зь яго выйшлі трое пасажыраў і прапанавалі актывісту "сесьці ў машыну, каб пагаварыць". Ён адмовіўся, яго пацягнулі сілком, распачалася бойка...

Яўген Парчынскі ня дужа ахвотна гаворыць пра падзеі, што здарыліся тры дні таму: "Не хацеў расказваць нікому. Але праз знаёмых усё ўжо трапіла ў інтэрнэт. Толькі я па-ранейшаму нічога не магу сказаць пра тое, што гэта былі за людзі, і што яны хацелі. У чым прычына, што мяне чакалі каля пад'езду, я ня ведаю. Аднак жа і высьветляць не хацелася: сядзеш з такімі ў машыну, а потым апынесься зьвязаным у лесе. Яны мне нічога не казалі, пра што будзем гаварыць. Толькі цягнулі. **Потым нехта з траіх ударыў пад вока, нехта — па рэбрах. Назаўтра я пайшоў у паліклініку, урачы сказалі, што ў мяне садны мяккіх тканак.** Нічога больш сур'ёзнага няма. Ня ведаю, ці будуць урачы паведамляць у міліцыю. Я, прынамсі, зьвяртацца туды не зьбіраўся. Бо каго яны там знойдуць?"

Паводле словаў Яўгена Парчынскага, яму дапамаглі адбіцца ад невядомых з "Фальксвагену" суседзі па пад'езьдзе. З часу здарэньня прайшло 3 дні, і больш яго ніхто не турбаваў.

Сябры Парчынскага, заснавальніка мясцовага незалежнага сайту "Свабодны рэгіён", выказваюць свае вэрсіі падзеяў. Яны гавораць пра імавернасьць таго, што **інцыдэнт можа быць зьвязаны з акцыяй у падтрымку палітвязьняў**, заплянаванай якраз на 12 жніўня. Гэта быў дзень народзінаў Мікалая Статкевіча, і ў Наваполацку зьбіраліся вывесіць расьцяжку з патрабаваньнем вызваліць яго ды іншых палітзьняволеных. Акцыя не адбылася. Спадар Парчынскі па-ранейшаму не зьбіраецца зьвяртацца ў міліцыю.

Віцебскі абаронца грамадзянскіх правоў зьвярнуўся па абарону да спэцдакладчыка ААН



Пётар Іваноў

Віцябчук **Пётар Іваноў** накіраваў скаргу на дзеяньні службовых асоб дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь на адрас спадарыні **Маргарат Сэкаг'і**, спэцдакладчыка Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў па пытаньні аб сытуацыі з праваабаронцамі. Ён просіць прызнаць, што службовыя асобы дзейнічалі ў адносінах да яго як праваабаронцы недапушчальным чынам, супярэчачы духу і літары «Дэклярацыі аб праве і абавязку пэўных асоб, груп і органаў грамадства падтрымліваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды».

Дэклярацыя, на якую спасылаецца Пётар Іваноў у сваёй скарзе, была прынятая рэзалюцыяй Генэральнай асамблеі ААН 9 сьнежня 1998 году. Таксама ён просіць спэцыяльнага дакладчыка прапанаваць Рэспубліцы Беларусь ліквідаваць дапушчаныя парушэньні і не дапускаць іх у будучыні.

У сваім звароце да прадстаўніка ААН Пётар Іваноў нагадаў храналёгію падзеяў. У сакавіку ён накіраваў на імя начальніка УУС Віцебскага аблвыканкаму **Ігара Яўсеева** заяву пра парушэньне супрацоўнікамі ДАІ правілаў дарожнага руху. Калі апошнія затрымлівалі грамадзкіх актывістаў **Аляксея Кішчука** і **Стаса Лаўрэнава**, якія ладзілі акцыю, і выехалі на ходнікі, Іваноў быў сьведкам падзеі.

Разьбіраўся па заяве падпалкоўнік **Аляксандар Сьцяпанаў**. Вынік разбору: замест таго, каб пакараць даішнікаў-правапарушальнікаў, пакаралі самога заяўніка — ён нібыта абгаварыў супрацоўнікаў міліцыі. Падпалкоўнік Сьцяпанаў склаў адпаведны пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні, і судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску **Валянціна Кісьмярошкіна** пакарала Іванова штрафам у памеры 4 мільёнаў рублёў.

Далей — больш. Судзьдзя Віцебскага абласнога суду **Сьвятлана Іванова**, якая разглядала касацыйную скаргу па справе, атрымала неабвержны доказ таго, што судзьдзя Кісьмярошкіна груба парушыла працэсуальна-выканаўчы кодэкс, выносячы рашэньня супраць змагара за правы грамадзян. Падчас судовага паседжаньня ёй быў уручаны аўдыёзапіс, які пацьвярджаў, што судзьдзя Кісьмярошкіна сфальсыфікавала вынесеную ёй пастанову: у залі суду ёй быў зачытаны адзін варыянт пастановы, а пазьней на рукі праваабаронца атрымаў зусім іншы варыянт. Паводле нармальнай лёгікі, справу павінны былі б вярнуць на новы разгляд, але судзьдзя Іванова вырашыла, што суд першай інстанцыі ўсё зрабіў правільна.

Больш таго, пасьля згаданых судоў было пастаўленае пытаньне аб узбуджэньні супраць Пятра Іванова крымінальнай справы. Па гэта ў Сьледчы камітэт зьвярнуўся старшыня Першамайскага райсуду Віцебску **А.А. Андрушэнка**. Падчас судовых паседжаньняў Іваноў нібыта абразіў супрацоўнікаў міліцыі, за што яму цяпер пагражае зьняволеньне тэрмінам да 3-х гадоў.

Але і гэтага мала. Надоечы намесьнік пракурора **Георгі КараньКо** вынес Іванову афіцыйнае папярэджаньне пра недапушчальнасьць парушэньня заканадаўства. Пётар Іваноў зьяўляецца грамадзянінам Расеі, які мае пасьведчаньне на жыхарства ў Беларусі. Дык вось, яго папярэдзілі, што ў выпадку далейшага парушэньня адміністрацыйнага або крымінальнага закону дазвол на яго пастаяннае пражываньне ў Рэспубліцы Беларусь можа быць анулюваны. У гэтым выпадку ён цягам месяца абавязаны будзе пакінуць тэрыторыю Беларусі, больш ня зможа свабодна ўяжджаць у краіну, у якой нарадзіўся і вырас, і сувязь зь сям'ёй, якая жыве ў Беларусі, будзе страчаная.

«Пакуль я ня ўсклаў на сябе абавязкі праваабаронцы, да мяне не было прэтэнзіяў з боку беларускай дзяржавы як да замежнага грамадзяніна. Але як толькі я пачаў актыўна абараняць правы і законныя інтарэсы грамадзян, я стаў "злосным парушальнікам" беларускіх законаў», — сьцьвярджае Пётар Іваноў.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.